# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*
## 10 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.**

| Слова | Лексічнае значэнне | м. р. / ж. р. |
|---|---|---|
| *шынель* | Форменнае паліто спецыяльнага пакрою, са складкай на спіне і хлясцікам | *м. р.* |
| *брыль* | Галаўны ўбор; казырок шапкі | *м. р.* |
| *бездараж* | Непраходнасць дарог; адсутнасць або недахоп добраўпарадкаваных дарог | *ж. р.* |
| *гаць* | Насціл з бярвення, галля, ламачча для праезду цераз балота ці гразкае месца | *ж. р.* |
| *рукапіс* | Помнік старажытнага пісьменства; тэкст, напісаны ад рукі | *м. р.* |
| *цемрадзь* | Адсутнасць святла, густы змрок; цемната | *ж. р.* |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 2.**

| Словы без прыстаўкі | Словы з адной прыстаўкай | Словы з дзвюма прыстаўкамі |
|---|---|---|
| абавязак | с-крутак | без-за-ганны |
| высакамерны | абяс-шкодзіць | не-па-хісны |
| выкладчыца (фізікі) | аб-уць | пера-а-пранууцца |
| | а-баронца | |
| | аб-няць | |
| | вы-бары | |

*За кожны правільны адказ (улічваецца месца слова і правільнасць вызначэння прыстаўкі) – 0,5 бала.*

**Заданне 3.**

| | | |
|---|---|---|
| *лес* | ***ахаваць*** | ***лесаахова / лесаахоўны*** |
| *лёс* | ***вызначаць*** | ***лёсавызначальны*** |
| *народ* | ***улада*** | ***народаўладдзе / народаўладства*** |
| *першы* | ***ствараць*** | ***першастваральнік*** |
| *роўны* | ***значыць*** | ***раўназначны*** |
| *свой* | ***воля*** | ***сваявольны*** |
| *слова* | – | – |

*За кожны правільны адказ – 1 бал. За лішняе (сёмае) слова адымаецца 0,5 бала.*

**Заданне 4.**

| **Злітнае напісанне** | **Напісанне праз дэфіс** |
|---|---|
| *Верхнянёманская нізіна* | *Балтыйска-Чарнаморскі водападзел* |
| *цяжкадаступныя прыродныя рубяжы* | *водна-ледавіковыя раўніны* |
| | *палітыка-геаграфічнае становішча* |
| | *фізіка-геаграфічнае раяніраванне* |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 5.**

| **Прыклады** | **Трэцяе лішняе (нумар)** | **Тлумачэнне** |
|---|---|---|
| *I. Простыя і складаныя сказы:*<br>1) Мне страшна, але іду (Я. Колас).<br>2) Чалавек, скажу вам, ніколі не павінен траціць веры ў жыццё (А. Пальчэўскі).<br>3) Паводле існуючай легенды, Магілёў быў закладзены ля магілы бясстрашнага змагара з сацыяльнай несправядлівасцю Машэкі (Л. Лыч). | 1 | 2 і 3 – простыя сказы;<br>1 – складаны сказ |
| *II. Від складанага сказа:*<br>1) Мінула шмат часу, пясчаныя кручы параслі травою і лесам, а яшчэ праз гады зацішныя мясціны на беразе ракі аблюбавалі пад жытло людзі… (М. Гіль).<br>2) Я выходжу на зялёны адхон і гляджу туды, дзе зусім яшчэ нядаўна было так многа вёсак, а цяпер бялеюць адны бярозы (В. Бялоў).<br>3) Вясною, калі пачыналі сеяць авёс, жураўы вярталіся з выраю, і іх песня ўжо не была такой журботнай, як увосень (А. Бялевіч). | 2 | 1 і 3 – складаныя сказы з рознымі відамі сувязі;<br>2 – складаназалежны з сузалежным аднародным падпарадкаваннем |
| *III. Від даданай часткі:*<br>1) Мартын імкнуўся выконваць даручэнне так, як рабіў бы сапраўдны партызан (Я. Колас).<br>2) Чуваць здалёку, як касцы мянташаць звонка косы (М. Калачынскі).<br>3) Яна [Яноўская] размаўляла пра каханне так, як іншыя жанчыны пра надвор’е (У. Караткевіч). | 2 | 1 і 3 – даданыя акалічнасныя часткі спосабу дзеяння;<br>2 – даданая дапаўняльная |
| *IV. Сінтаксічная функцыя злучальнага* | 3 | 1 і 2 – злучальнае |

| | | |
|---|---|---|
| *слова:*<br>1) У тоне Славікавага адказу была пашана да Машы, што той вельмі падабалася (І. Шамякін).<br>2) Пум стаяў побач з зубранём, трос кудластай галавой, адганяў тых, хто хацеў дакрануцца да малога (Я. Зазека).<br>3) Што вінен, аддаць павінен (прыказка). | | слова з'яўляецца дзейнікам;<br>3 – злучальнае слова з'яўляецца дапаўненнем |

*За кожнае правільнае вызначэнне нумара трэцяга лішняга – 0,5 бала, за кожнае правільнае тлумачэнне – 1 бал.* ***Выяўленне трэцяга лішняга і, адпаведна, абгрунтаванне павінны рабіцца выключна зыходзячы з названых умоў.***

**Заданне 6.**

| | | |
|---|---|---|
| *заводзіцца* | 'вельмі хутка даходзіць да ўзбуджанасці, узрушанасці, хвалявання' | ***заводзіцца з паўабароту*** |
| *паплакаць* | 'паскардзіцца некаторы час на свой лёс, каб расчуліць каго-н., выклікаць спагаду да сябе' | ***паплакаць у камізэльку*** |
| *прабіваць* | 'рабіць гранічныя намаганні для дасягнення чаго-н.' | ***ілбом сцяну прабіваць*** |
| *пратрубіць* | 'надакучыць пастаяннымі размовамі пра што-н.' | ***пратрубіць усе вушы*** |
| *прыгрэць* | 'зрабіць дабро чалавеку, які пасля адплаціў няўдзячнасцю' | ***прыгрэць змяю на сваіх грудзях*** |
| *прыкладаць* | 'хто-н. вельмі пакорлівы, памяркоўны, згаворлівы' | ***хоць да раны прыкладай*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Фігурка ўяўляла сабой двух чалавечкаў, музыкаў-жабракоў *(убогіх / бедных музыкаў / музыкантаў)*, са скуластымі мангольскімі тварамі, вузкімі шчылінкамі вачэй і пляскатымі насамі. Маленечкая *(малюсенькая)* драўляная скульптура, памерам з запалкавы *(запалачны)* пачак, не болей. Музыкі ішлі скрозь дождж і вецер, іх лахманы *(лахмоцце / рызманы)* развяваліся, жоўтыя твары былі абпаленыя сонцам. Па выразе іх твараў, па расцягнутых ратах было відаць, што яны спяваюць нешта жаласнае, аднастайнае, звычнае *(прывычнае / звыклае)*.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **А** | **–** | **І** | **–** | **2** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Б** | **–** | **ІІІ** | **–** | **3** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **В** | **–** | **ІІ** | **–** | **4** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Г** | **–** | **V** | **–** | **1** |

*За кожны правільны адказ у групе (трыядзе) – 1,5 бала. Напрыклад, калі дадзены адказ А–І–2, то залічваецца 1,5 бала, а калі А–І–3 ці А–ІІ–2, то 0 балаў.*

**Заданне 9.**



Гэта ***Максім Багдановіч***
Імя сапраўднае / ~~псеўданім~~
Сапраўднае імя ____________________



Гэта ***Іван Мележ***
Імя сапраўднае / ~~псеўданім~~
Сапраўднае імя ____________________



Гэта ***Змітрок Бядуля***
Імя ~~сапраўднае~~ / псеўданім
Сапраўднае імя ***Самуіл Плаўнік***



Гэта ***Уладзімір Караткевіч***
Імя сапраўднае / ~~псеўданім~~
Сапраўднае імя ____________________



Гэта ***Максім Танк***
Імя ~~сапраўднае~~ / псеўданім
Сапраўднае імя ***Яўген Скурко***

*За кожны правільны подпіс партрэта – 0,5 бала; за кожнае правільнае вызначэнне, ці сапраўднае імя – 0,5 бала; за правільнае вызначэнне сапраўднага імя Максіма Танка – 0,5 бала, Змітрака Бядулі – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Ацэнка за заданне складаецца з трох кампанентаў: правільнасці вызначэння назвы твора, ацэнкі выбару эпізодаў з тлумачэннем выбару і ацэнкі закадравага тэксту.*

*За правільнае вызначэнне назвы твора ("Раскіданае гняздо") – 0,5 бала.*

*За кожны эпізод з тлумачэннем – 0,5 бала.*

*Закадравы тэкст:*

| *Крытэрый* | *Колькасць балаў* |
|---|---|
| *Прадстаўленне асноўных герояў (не менш за 3)* | *1* |
| *Тлумачэнне гледачу, пра што фільм* | *1* |
| *Захаванне інтрыгі* | *0,5* |
| *Сувязь тэксту з выбранымі эпізодамі* | *1* |
| *Колькасць слоў у тэксце, не большая за 200* | *0,5* |